**КАТАХРЭ́ЗА** (ад грэч. kataehrēsis злоўжыванне), 1) троп, у якім словы выкарыстаны пераважна з супрацьлеглым значэннем (тое, што і *аксюмаран*). 2) Ужыванне ў маст. (публіцыст.) тэксце слоў або выразаў у пераносным сэнсе, які супярэчыць іх звыкламу этымалагічнаму значэнню (напр., «чырвонае чарніла», «чорная бялізна»). У антычнасці адрознівалі К. «неабходную» — калі на тое, што не мае свайго наймення, пераносіцца найменне блізкіх, падобных прадметаў ці з'яў (напр., «падэшва гары», «рукаў рэчкі»). Звычайна надае аўтарскаму выказванню непра-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дугледжаны камізм, які выяўляецца ў лагічнай неадпаведнасці аб'яднаных вобразных выказванняў: «Сонца нашай літаратуры, ён хуткай каметай пранёсся па небасхіле».

*В.І.Еўмянькоў.*